У Гомлі пачалі судзіць удзельніцу Маршу пратэсту. Пацярпелы ад яе дзеянняў амапавец залегендаваны

24.11.2021



Падчас Маршу пратэсту 27 верасня 2020г.

Сёння ў судзе Цэнтральнага раёну распачаўся суд над 49-гадовай гамяльчанкай **Ларысай Кузьменкай** (суддзя **Салоўскі**, пракурор **Сідоранка**). Жанчыну вінавацяць па арт.364 КК РБ «Гвалт ці пагроза гвалту ў дачыненні да супрацоўніка МУС пры выкананні ім сваіх службовых абавязкаў».

Суддзя **Салоўскі** зачытаў даведку з медчасткі СІЗА №3, дзе пазначана што па стане здароўя **Кузьменка** можа ўдзельнічаць у судзе.

Пацярпелы амапавец **Пятроў** (прозвішча несапраўднае) у суд не з'явіўся, бо знаходзіцца на бальнічным. У судзе была зачытана заява пацярпелага з просьбай разглядзець крымінальную справу ў яго адсутнасць.

Абаронца **Кузьменкі Фаменка** выказалася супраць разгляду справы ў адсутнасць пацярпелага, бо для ўсебаковага разгляду акалічнасцяў справы ёй неабходна задаць яму пытанні.

> *"У справе ёсць тры допыты пацярпелага і яны супярэчлівыя. Каб ухіліць супярэчнасці трэба дапытаць у судзе пацярпелага. У заяве пацярпелага не ўказана, што хвароба сур'ёзная, працяглая". – кажа адвакатка.*

Салоўскі прыняў рашэнне – разглядаць справу ў адсутнасці пацярпелага **Пятрова.**

Пракурор **Сідоранка** зачытаў абвінавачанне з якога вынікала, што **Ларыса Кузьменка** 27 верасня ў 15.30 знаходзілася на вуліцы Савецкая, з'яўлялася ўдзельніцай масавага мерапрыемства, якое праводзілася ў парушэнне існуючага парадку яго правядзення». Яна дзейнічала «па матывах палітычнай варожасці, з мэтай перашкодзіць законнай дзейнасці супрацоўніка атрада міліцыі асобага прызначэння АУС Гомельскага аблвыканкаму, які дзейнічаў у адпаведнасці са службовымі інструкцыямі і нёс ахову грамадскага парадку».

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ


Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ



Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі



Падчас Маршу пратэсту 27 верасня 2020г.

Па версіі абвінавачання, **Кузьменка** разумела, што перад ёй знаходзіцца супрацоўнік унутраных спраў у форме і мела намер прычыніць шкоду камандзіру ўзвода баявога прызначэння АМАПу Пятрову П.П. Таму, выкарыстала гвалт у дачыненні да **Пятрова**: «выкарыстоўваючы грубую фізічную сілу, схапіла за руку **Пятрова** і ўтрымлівала яе каб калона пратэстоўцаў магла бесперашкодна прайсці. Потым яна апусцілі яго руку долу, тым самым змясціла пацярпелага з месца. Такім чынам пазбавіла яго фізічнай магчымасці выконваць яго службовыя абавязкі. Прычыніла **Пятрову** пабоі і фізічны боль. Такім чынам, Кузьменка здзейсніла гвалт над супрацоўнікам міліцыі каб перашкодзіць яго законнай дзейнасці».



Падчас Маршу пратэсту ў Гомлі 27 верасня

Кузьменка віну не прызнала. Калі давала паказанні плакала. Казала вельмі ціха.

> *«У абвінавачанні сказана тое, што я ніколі не рабіла, – заявіла ў судзе абвінавачаная. – Я не ішла ў калоне ўдзельнікаў масавага мерапрыемства па вуліцы Савецкай. Я знаходзілася на Савецкай з боку цырка».*

Ад дачы далейшых паказанняў **Ларыса Кузьменка** адмовілася.

Суддзя **Салоўскі** паведаміў прысутным, што і падчас следства **Кузьменка** паказанняў не давала.

Абаронца **Фаменка** выказалася, што яна не разумее на якой падставе пацярпелага залегендавалі. Няма аніякіх фактаў, што Кузьменка яму пагражала і з-за гэтага ўзнікла патрэба яго легендаваць.

Адвакатка прасіла суд зрабіць запыт у паліклініку наконт хваробы пацярпелага **Пятрова** – калі канкрэтна ён будзе працаздольным.

> *«Няма сведчанняў, што ў яго пераломы і ён не можа перасоўвацца і гэтая хвароба ў яго будзе цягам 2-3 тыдняў, месяцаў, ці паўгады. Такім чынам, пакуль няма паважлівай прычыны абвясціць яго паказанні падчас следства». – рэзюмавала абаронца.*

Суддзя **Салоўскі** прыняў рашэнне зачытаць паказанні пацярпелага падчас следства, даведку з паліклінікі наконт працягласці бальнічнага не запрошваць.

У судзе абвясцілі паказанні падчас трох допытаў пацярпелага амапаўца **Пятрова**.

> *«Я стаяў у ачапленні каб перашкодзіць калоне ўдзельнікаў несанкцыянаванай акцыі прайсці па Савецкай. – паведамляў следству **Пятроў**. – Калі **Сняжкова** дайшла да мяне, яна нешта крычала і казала ў мой бок. Я пачуў крыкі: «Наперад, не спыняемся». **Сняжкова** пачала піхаць маю руку, яна нанесла мне адзін удар локцем, я адчуў боль, мая рука расслабілася і калона пайшла наперад, ачапленне было разарвана. Я трапіў у цэнтр натоўпу. Раптам адчуў, як нехта ззаду пацягнуў мяне за бронекамізэльку. Я спужаўся за захаванасць зброі і спецсродкаў, развярнуўся і ўбачыў мужчыну 40-45 год. Паспрабаваў яго затрымаць, але ён уцёк на іншы бок вуліцы. Каля кафэ «Румянцаўскае» мы зноў сталі ў ачапленне».*

Падчас другога допыту пацярпелы даваў такія самыя паказанні, як і першы раз.



Падчас Маршу пратэсту 27 верасня 2020г.

На трэцім допыце пацярпелы амапавец узгадаў новыя акалічнасці справы: калі яго ў натоўпе нехта ззаду пацягнуў за бронекамізэльку, ён павярнуўся і ўбачыў мужчыну, які схапіў яго за руку. А ў гэты час самаго мужчыну адцягвала нейкая жанчына.

> *«**Кузьменка** схапіла мяне за руку і павісла на мне сваім целам», – распавёў следчаму пацярпелы.*

Таксама **Пятроў** апазнаў у мужчыне, які пацягнуў яго за бронекамізэльку, **Уладзіміра Няпомняшчых** (мужчына ўжо адбывае пакаранне па іншай крымінальнай справе, - ад аўт.)

У справе абвешчаны перапынак. Працяг суду прызначаны на 25 лістапада.

Ларыса Кузьменка знаходзіцца пад вартай з 6 жніўня.



Аўтар **Ларыса Шчыракова**

Гомельская вясна

ВІДЭА



БЛОГІ



ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага пратрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

20.04.2023 Андрэй Горват з'ехаў з Беларусі. Што будзе з

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ

08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь

палацам у Нароўлі? «Новы час»

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»


07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на двухбаковую пнеўманію «Народная воля»

26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі

23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і Берасцейшчыны

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ



ПАРТНЁРЫ

© 2023 Гомельская вясна

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com